ЗАЦВЯРДЖАЮ
Намеснік старшыні
аргкамітэта трэцяга этапу
рэспубліканскай алімпіяды па
вучэбных прадметах,
намеснік начальніка
ўпраўлення адукацыі
Магілёўскага аблвыканкама
____________А.У. Сцельмашок
“____” лістапада 2012 г.

ЗАДАННІ (комплексная работа)
другога этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах
“Беларуская мова” і “Беларуская літаратура” 2012/2013 навучальнага года

Дата правядзення: **1 снежня 2012 г.**

**9 клас**

1. Перакладзіце прапанаваныя назоўнікі на беларускую мову. Укажыце, якімі гукамі адрозніваюцца беларускія словы і іх рускамоўныя адпаведнікі:

| **Слова па-руску** | **Слова па-беларуску** | **Якімі гукамі адрозніваюцца** |
|---|---|---|
| лампа | | |
| медь | | |
| шёлк | | |
| орех | | |
| пробег | | |
| жёлудь | | |
| шея | | |

2. Беларускі пісьменнік і мовавед **Уладзімір Дубоўка** ў артыкуле “Некаторыя прыватныя выпадкі мілагучнасці нашае мовы” (1927) прапанаваў удакладніць ужыванне прыстаўнога *в* у пачатку слоў. У прыватнасці, У. Дубоўка сфармуляваў правіла ўжывання прыстаўнога *в* перад ненаціскным *а.* Свае правіла пісьменнік праілюстраваў прыкладамі: *вялікія вазёры, на вялікіх азёрах; ночкаю васенняю, спраўляў асяніны.* Паспрабуйце і вы сфармуляваць прыдуманае У. Дубоўкам правіла.

_______________________________________________________________________________
_______________________________________________________________________________
_______________________________________________________________________________

3. Укажыце фразеалагізмы з кампанентам *рукі*, якія маюць наступнае значэнне:

| **Значэнне фразеалагізма** | **Фразеалагізм** |
|---|---|
| ‘хто-небудзь вельмі ўмелы і здольны ў сваёй справе чалавек’ | |
| ‘адчуваць, перажываць вялікае задавальненне ад поспеху ў якой-небудзь справе’ | |
| ‘адной асобе (прадаваць, адпускаць, даваць і пад.)’ | |
| ‘няма часу, магчымасці заняцца чым-небудзь, кім-небудзь’ | |
| ‘адмаўляцца ад удзелу ў чым-небудзь, ухіляцца ад адказнасці’ | |

4. Устаўце ў табліцу патрэбныя формы назоўніка

| **Форма адзіночнага ліку Н. скл.** | **Памяншальная форма** | **Форма, якая спалучаецца з лічэбнікамі 2, 3, 4** | **Форма множнага ліку** | |
|---|---|---|---|---|
| | | | **Н. скл.** | **Р. скл.** |
| *поле* | | | | |
| | *стрэшка* | | | |
| | | *дны* | | |
| | | | *коні* | |
| | | | | *шчок* |

5. З кожнай пары выберыце прыслоўе і зрабіце яго словаўтваральны разбор:
*1) затое – наяве;* ________________________________________
*2) удвух – двума;* ________________________________________
*3) хіжа – нябожа;* ________________________________________
*4) як-небудзь – якісьці;* ________________________________________
*5) ледзь-ледзь – такі-сякі;* ________________________________________
*6) засолка – задужа;* ________________________________________
*7) зухавата – шклавата;* ________________________________________

6. У папулярнай сацыяльнай сетцы існуе суполка Літ.бел. ("Літары па-беларуску"), на старонцы якой штодня з'яўляюцца фотаздымкі, падпісаныя афарыстычнымі выслоўямі. У пададзеных ніжэй выслоўях абазначце выказнікі і вызначце іх від:

| Сказ | Выказнік | Від выказніка |
|---|---|---|
| Твае думкі паступова становяцца тваім жыццём. | | |
| І хай халодным вечарам для вас знойдуцца цёплыя словы. | | |
| Чалавека нельга забыць. | | |
| Вечны толькі свет мары. | | |
| Жыццё навучыць смяяцца скрозь слёзы. | | |

7. Устаўце прапушчаныя назоўнікі ў фрагмент верша **Людмілы Рублеўскай**. Звярніце ўвагу на змешчаныя ў даведцы значэнне і характарыстыку прапушчаных слоў.

*Першы снег над 1)_______________,*
*І мерзнуць званы на званіцы;*
*І ў маленькі 2)_____________ з'язджаецца шляхта на баль.*
*І глядзяць з-пад рукі на паненак здаля 3)_______________ –*
*4)____________ мясцовы, загадкавы, просты, як белы 5)____________.*

**Даведка**:
1) (устарэлае) 'пасёлак гарадскога тыпу' – у форме Т.скл.;
2) 'зямельнае ўладанне памешчыка';
3) 'маладая замужняя жанчына' – у форме мн. ліку;
4) (зборны) 'людзі, група людзей, з'яднаных супольнасцю жыцця';
5) 'лёгкая бавоўняная або з набіўным малюнкам тканіна'.

8. Рэмінісцэнцыяй у літаратуразнаўстве называецца наўмыснае ці міжвольнае ўзнаўленне пісьменнікам (найчасцей паэтам) вобразаў, асобных выказванняў ці рытміка-сінтаксічных канструкцый іншых аўтараў.
Знайдзіце рэмінісцэнцыі з беларускай літаратуры ў наступных паэтычных фрагментах сучасных літаратараў. Укажыце творы, якія паслужылі асновай для рэмінісцэнцый, і іх аўтараў.

| Фрагмент з рэмінісцэнцыяй | Твор – крыніца рэмінісцэнцыі | Аўтар |
|---|---|---|
| *... У якім Беларусь, за якою ішоў,*<br>*Як да песні, якую пяе Белавежа,*<br>*На святлынь наваградскіх зажураных вежаў,*<br>*На шум рэк, што змывалі варожую кроў* (В. Шніп). | | |
| *І птушкі, і звяры*<br>*глядзяць свае віры...*<br>*але прыемна, што б там ні казалі,*<br>*заснуўшы на баку,*<br>*прачнуцца ў цягніку...* (А. Хадановіч). | | |
| *А хто гэта там ідзе,*<br>*па вушы ў глыбокай багне...* (А. Хадановіч). | | |